

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№11(87)

10 ліпеня 2012 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

САВЕТ ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА ЗАКЛІКАЎ БЕЛАРУСКІЯ ЎЛАДЫ ВЫЗВАЛІЦЬ УСІХ ПАЛІТЗНЯВОЛЕНЫХ

Савет ААН па правах чалавека прагаласаваў за ўвядзенне мандата спецдакладчыка па Беларусі. Аб гэтым паведаміла інфармацыйнае агенцтва БелаПАН. Па звестках агенцтва, за такое рашэнне выступілі 22 краіны, супраць — 5, устрымаліся — 20.



У рэзалюцыі па Беларусі, прынятай 5 ліпеня на сесіі Савета ААН па правах чалавека ў Жэневе, утрымліваецца заклік да беларускіх уладаў «неадкладна і безумоўна вызваліць усіх палітзняволеных», правесці «поўнае і транспарэнтнае расследаванне ўсіх паведамленняў аб прымяненні катаванняў і негуманным абыходжанні з палітзняволенымі», «неадкладна спыніць практыку адміністрацыйных затрыманняў прадстаўнікоў апазіцыі, грамадзянскай супольнасці, журналістаў і праваабаронцаў і не перашкаджаць іх свабоднаму перамяшчэнню, у тым ліку выездам за межы краіны».

Дакумент заклікае афіцыйны Мінск выканаць усе рэкамендацыі, што ўтрымліваюцца ў дакладзе вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека аб сітуацыі ў Беларусі, якія быў прадстаўлены падчас сесіі.

Рэзалюцыя таксама ўтрымлівае заклік да беларускага ўрада аб паўнацэнным супрацоўніцтве са спецдакладчыкам, прадастаўленні яму ўсёй неабходнай інфармацыі і магчымасцяў наведаць краіну.

Нагадаем, 27–28 чэрвеня на сесіі Савета ААН па правах чалавека быў прадстаўлены даклад вярхоўнага камісара Наві Пілэй аб сітуацыі ў Беларусі, які закранаў перыяд са снежня 2010 года па сакавік гэтага.

На сённяшнім пасяджэнні савета рэзалюцыю па Беларусі ад імя Еўрасаюза і дзяржаў, што яе падтрымалі, прадставіў Кіпр, які з 1 ліпеня старшынствуе ў ЕС. Прадстаўнік гэтай краіны падкрэсліў, што пагаршэнне сітуацыі і парушэнні правоў чалавека прадоўжыліся ў Беларусі і пасля закранутага ў дакладзе камісара перыяду. Ён таксама заявіў, што ЕС заклапочаны прымяненнем смяротнай кары ў Беларусі і заклікае да ўвядзення мараторыя на гэты від пакарання.

ГАРАНТИЯ НА БЕЛОРУССКУЮ АЭС — ДВА ГОДА

Российский эксперт-физик Андрей Ожаровский обратил внимание на срок гарантийной эксплуатации стоящейся в Беларуси АЭС.


В своей статье он отметил следующее.

«Недавно о проблемах АЭС высказался и Александр Лукашенко. 22 июня БЕЛТА передало слова Лукашенко: «Мы же строим самую безопасную станцию, и ответственность здесь несёт и своей репутацией, и всем, чем только можно, Россия».

Не хочется комментировать веру Лукашенко в безопасность АЭС — эта вера основана или на неосведомлённости о реальной ситуации в атомной промышленности, или на недостатке естественнонаучного образования. Но вот вопрос об ответственности России за белорусскую АЭС решён в Соглашении «О сотрудничестве в строительстве на территории Республики Беларусь атомной электростанции», которое подписали в Минске 15 марта 2011 года Генеральный директор Государственной корпорации по атомной энергии «Росатом» С.В.Кириенко и Министр энергетики Республики Беларусь А.В.Озерец.

Статья 3 указанного Соглашения устанавливает период гарантийного срока эксплуатации АЭС — «в течение двух лет с даты подписания заказчиком и генеральным подрядчиком акта о передаче блока заказчику в гарантийную эксплуатацию». Случись что после двух лет, и Россия никакой ответственности не будет нести, разве что моральную. С моральной ответственностью у госкорпорации «Росатом» всё в порядке…

Нынче для многих моделей бытовой техники гарантийный период может составлять более двух лет, а тут два года для АЭС стоимостью 10 миллиардов долларов… Неужели А.В.Озерец не проинформировал об этом А.Г.Лукашенко?»



АПАЗІЦЫЯНЕРЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ ВЫСТУПІЛІ ЗА БАЙКОТ ВЫБАРАЎ У ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ

Кааліцыя аб'яднаных дэмакратычных сілаў Магілёўшчыны выступае за байкот выбараў у Палату прадстаўнікоў.

Такая пазіцыя была агучаная 22 чэрвеня пасля паседжання каардынацыйнай рады кааліцыі, праінфармавала сваіх слухачоў Радыё Свабода. Між тым два дзясяткі прадстаўнікоў апазіцыйных арганізацыяў рэгіёну ўжо гатовыя вылучыцца кандыдатамі ў Палату прадстаўнікоў. Апазіцыянеры заяўляюць, што іх удзел у выбарчай кампаніі абмяжуецца толькі інфармацыйнай працай з насельніцтвам.

«Умовы, якія кааліцыя выстаўляла, улада на дадзены момант не выканала, таму мы пацвердзілі сваю ранейшую пазіцыю адносна выбараў у Палату прадстаўнікоў — гэта іх байкот. Не вызваленыя палітвязні, не зменена выбарчае заканадаўства. Будуць вылучацца і кандыдаты, але не для таго, каб змагацца за месцы ў Палаце, а каб весці інфармацыйную кампанію. Іншай магчымасці данесці нашу праўду пра сітуацыю ў краіне ў нас проста цяпер няма. Будзем заклікаць выбарцаў не ўдзельнічаць у гэтых выбарах. Каля дваццаці кандыдатаў гатовыя ўключыцца ў такую працу. Мы будзем актыўна ўдзельнічаць у назіранні. Будзем вылучаць кандыдатаў у акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі. Гэта будзе



адным з паказчыкаў, ці гатовыя ўлады мяняць цяперашнія правілы гульні. Але, паўтаруся, мы не разглядаем гэтыя выбары як сапраўдныя, бо ў нас няма падстаў іх лічыць такімі», — заявіў пасля паседжання каардынацыйнай рады кааліцыі яе старшыня Юры Новікаў.

Як паведаміў Юры Новікаў, неўзабаве кааліцыя дэмакратычных сілаў Магілёўшчыны выкажа сваю пазіцыю адносна выбараў у адмысловым звароце да грамадскасці.

Кааліцыя дэмакратычных сілаў Магілёўшчыны аб'ядноўвае мясцовыя апазіцыйныя палітычныя арганізацыі, недзяржаўныя прафсаюзы і неўрадавыя аб'яднанні. Яна была заснаваная для каардынацыі дзейнасці суб'ектаў палітыкі падчас электаральных кампаніяў. Утварылі яе ў 2001 годзе. Пра байкот сёлетніх выбараў у Палату прадстаўнікоў апазіцыянеры Магілёўшчыны заявілі 5 сакавіка 2011 году. Сёння гэтая пазіцыя была пацверджаная.

КЛИМОВИЧСКАЯ РАЙОНКА АГИТИРУЕТ ЧИТАТЕЛЕЙ К УЧАСТИЮ В ВЫБОРАХ

Тимур НЕЗВАНОВ

Выборы-2012 привлекают к себе всё больше внимания. 7 июля на сайте spring96.org была размещена следующая информация:

В субботнем номере (№ 51 от 7 июля 2012) Климовичской районной газеты «Родная ніва» наконец-то появился собственный материал, посвященный выборам в Палату представителей. Статья на первой полосе имеет название «Гражданский долг каждого белоруса».

Автор материала Никифор Минченко призывает жителей Климовичского района к активному участию в избирательной кампании, что называет гражданским долгом каждого белоруса.

«Гражданский долг каждого белоруса — принять активное участие в выборах депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь. От того, насколько дееспособным будет новый парламент, во многом зависит перспектива развития республики на ближайшие четыре года», — уверяет автор статьи и одновременно главный редактор «Роднай нівы».

Также газета сообщает, что вопросы подготовки к избирательной кампании были обсуждены на производственном совещании, которое провел с активом района в последний день июня председатель Климовичского райисполкома Василий Захаренко.

Другие районные газеты Могилевской области теме парламентских выборов до сих пор уделяют совсем незначительное внимание. Большинство из них разместили на своих страницах только официальные сообщения БЕЛТА о начале избирательной кампании. Собственные публикации на эту тему в районках практически отсутствовали как весь июнь, так и в начале июля.

P. S. Кстати, хотелось бы напомнить нашим избирателям, что участие в выборах — абсолютно добровольное. Раздаются призывы исполнить гражданский долг, но не будем забывать, что по закону только сам избиратель решает, участвовать ему в выборах или нет, идти голосовать или нет. Вот что гласит Избирательный Кодекс РБ, Статья 5. Свободные выборы и участие в референдуме:

«Выборы Президента Республики Беларусь, депутатов Палаты представителей, депутатов местных Советов депутатов, участие в референдуме являются свободными: избиратель, участник референдума лично решает, участвовать ли ему в выборах, референдуме, за кого голосовать на выборах, за что голосовать на референдуме».

У ПАЎЛАВІЧАХ САБРАЛІ ПОДПІСЫ ЗА РАМОНТ ТРОХ ВУЛІЦ

Міхась ПЯТРОЎ

У Клімавіцкім раёне ў вёсцы Паўлавічы 19-20 чэрвеня былі сабраныя подпісы за рамонт трох вуліц. Аб гэтым паведаміў незалежным СМІ адзін з удзельнікаў збору подпісаў, мясцовы грамадскі актывіст Аляксандр Балобін. Ён падкрэсліў, што ініцыятарамі сталі самі жыхары Паўлавічаў. А каб нашым чытачам лепей зразумець сутнасць падзеі, нагадаем яе перадгісторыю.

Яшчэ вясной Аляксандр Балобін прапанаваў аднавяскоўцам звярнуцца ў Клімавіцкі райвыканкам са зваротам наконт рамонту аўтадарогі, якая праходзіць праз Паўлавічы. Тое, што дарога даўно патрабуе рамонту, ніхто не адмаўляў. Разам з тым да прапановы, што ў прынцыпе зразумела, спачатку паставіліся скептычна. Людзі казалі Аляксандру, што толькі ўлады вырашаюць такія пытанні і ніякія подпісы тут не дапамогуць.

Пасля спрэчак і неабходных тлумачэнняў у сярэдзіне красавіка пад зваротам паставілі подпісы 25 чалавек. У тым жа месяцы паперу перадалі ў аддзел па зваротах грамадзян Клімавіцкага райвыканкама. Рэакцыя ўладаў аказалася непрадказальнай. У вёску прыехалі супрацоўнікі міліцыі, якія наведалі ўсіх грамадзян, што падпісаліся пад зваротам з патрабаваннем зрабіць рамонт аўтадарогі. У людзей бралі тлумачэнні, ці сапраўды яны паставілі свой подпіс. Паказальна, што міліцыянеры займаліся гэтым на працягу трох дзён і нават у святочны дзень 1 траўня, які з'яўляецца выходным у Рэспубліцы Беларусь.



Дасюль незразумела, навошта да гэтай справы прыцягнулі міліцыю, але сапраўднасць подпісаў была пацверджана. Магчыма, раённыя ўлады спадзяваліся на тое, што жыхары Паўлавічаў пачнуць ўхіляцца ад сваёй ініцыятывы і іхні зварот можна будзе ліквідаваць як несапраўдны. Атрымалася інакш, а завадатар Балобін увогуле патэлефанаваў у Магілёўскі аблвыканкам і паведаміў, што райвыканкам затрымлівае адказ. Урэшце рэшт дзесьці праз месяц дарожныя будаўнікі зрабілі частковы рамонт, месцамі паклалі новы асфальт і засыпалі ямы. На большае ў раёне не хапае фінансавых сродкаў — менавіта так патлумачыў сітуацыю ва ўласнай размове з Аляксандрам Балобіным старшыня райвыканкаму. Тым не менш, нельга не прызнаць, што паўлавіцкія жыхары здолелі дамагчыся свайго.

Якія з усяго гэтага можна зрабіць высновы? Відавочна, што пры жаданні ўлады могуць адшукаць магчымасць станоўчага вырашэння праблемы і паразумецца з людзьмі. Усё ж такі недахоп сродкаў — гэта адно, а давер да ўлады як прадстаўніцы грамадскіх інтарэсаў — зусім іншае. Тым больш, што грамадзяне паказалі, што яны якраз не збіраюцца адмаўляцца ад сваіх інтарэсаў. Аб гэтым, дарэчы, сведчыць новы збор подпісаў. Подпісы збіраліся за рамонт асвятлення на вуліцах Працоўная і Набярэжная, а таксама за падсыпку гравіем дарогі на вуліцах Набярэжная і Школьная.

"Людзі вельмі ахвотна ставілі свае подпісы пад зваротам, бо пасля дажджу на гэтых вуліцах утвараюцца такія балоты, што на машыне ніяк не праехаць. Даводзіцца ўвесь час штурхаць ааўтамабілі. Каб праехаць, некаторыя нават праз уласныя агароды дарогі праклалі", — адзначыў Аляксандр Балобін. 21 чэрвеня чарговы зварот з вёскі Паўлавічы быў перададзены ў райвыканкам, дзе яго зарэгістравалі за нумарам 138-3-1. Застаецца спадзявацца, што цяпер у чыноўнікаў хопіць розуму абысціся без міліцыі.

НАМЕСНІКАМ МІНІСТРА АДУКАЦЫІ СТАЎ ЧАЛАВЕК, ЯКІ НІ ДНЯ НЕ ПРАЦАВАЎ У ШКОЛЕ



Сталі вядомыя біяграфіі шэрагу новых прызначэнцаў. Газета "Наша Ніва" звярнула ўвагу, што намеснікам міністра адукацыі стаў Сяргей Руды. З ягонай біяграфіі, што з'явілася на сайтах дзяржорганаў, вынікае, што гэты чалавек... ніколі не адпрацаваў і дня ў школе. Ён кадравы вайсковец. Нарадзіўся ў 1962 годзе ў Заслаўі пад Мінскам. Скончыў Сумскую артылерыйскую вучэльню і прайшоў шлях ад камандзіра ўзвода да начальніка ўпраўлення будаўніцтва і эксплуатацыі Узброеных сілаў.

У Мінадукацыі ён будзе адказваць за матэрыяльна-тэхнічную базу, але факт застаецца фактам: праблемамі ўстановаў адукацыі будзе займацца не педагог, а вайсковец.



ДЗІЦЯ ВАЙНЫ

Генадзь АЎСЯНІКАЎ

Мінулы век у памяці сучаснікаў. Я, як ні кажыце, — дзіця вайны. Я 35-га году нараджэння, у 41-м годзе я жыў у Клімавіцкім раёне Магілеўскай вобласці.

Памятаю, як увайшлі ў вёску немцы. Уяжджае танк пасярэдзіне вуліцы. На башні сядзіць немец — па пояс голы, цывільны капялюш на галаве і на губным гармоніку грае. Паказвае, што трэба замаскіраваць танкі, каб не забамбілі. Ну і мы ламаем усё — яблыні, грушы, вішні ды ў кожную шчыліну ўтыкваем. І нам даюць за гэта пліткі шакаладу. Я ж не ведаў, што гэта шакалад. Гэта зараз я ведаю… А тады за зробленую працу, за тое, што мы замаскіравалі танкі, даюць нешта такое салодкае. Памятаю, дарослыя прачыталі надпіс на танку "Парыж".

Потым, калі адыходзілі немцы… Дамы гараць, і калона нямецкіх салдатаў ідзе. І раптам з гэтай калоны выходзяць два нямецкіх салдата ў плашчовых накідках. Нехта сказаў: "Страляць будуць…". А яны падыйшлі і дзве буханкі хлеба кінулі. І пайшлі зноў у строй. Мы думаем, напэўна, атручаныя. А тут жа вёска гарыць. Усе збегліся туды, і каты, і сабакі. Мужыкі кажуць, давайце на катах праверым. Адламалі кусочак — каты за мілую душу паелі ўсё гэта, і нічога з імі ня сталася.

Вось, я хачу сказаць, не ўсе немцы былі кепскія, як гэта было прынята гаварыць. Адступаючы чалавек аддаў апошні кавалак хлеба.

А на наступную раніцу сядзім у бліндажы… Бяз даху, так у зямлю ўкапаліся. І вось толькі сонейка ўзыходзіць, толькі такі блакіт нябёсаў, і раптам з лесу чуваць: "Ура-а, тра-та-та, тваю маць…". І хтосьці з мужыкоў сказаў: "Во, нашы ідуць…".

**** АЎСЯНІКАЎ ГЕНАДЗЬ СЦЯПАНАВІЧ – вядомы беларускі акцёр, мае больш за 80 роляў у тэатры і кіно («Долгие версты войны», «Последнее лето детства»). Народны артыст СССР (1991). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1988), узнагароджаны медалем Францыска Скарыны (1995).***

РУІНЫ ІМПЕРСКАЙ ВЕЛІЧЫ

12 чэрвеня 2012 года вайсковы лётчык першага класа падпалкоўнік Мікалай Грыднеў на авіяпалігоне паблізу мястэчка Бярозаўка Лідскага раёну выконваў манеўры на гранічна малой вышыні, калі ягоны «СУ-25» страціў кіраванне. Грыдневу далі каманду катапультавацца. Але пілот загінуў, адводзячы самалёт ад вёскі Навіны Наваградскага раёну. У Мікалая Грыднева засталіся жонка і дзве дачкі — 8 гадоў і 8 месяцаў.

Валер Каліноўскі, журналіст Радыё Свабода, паведамляе, што за тры апошнія гады ў Беларусі разбіліся 5 вайсковых самалётаў і загінулі 8 лётчыкаў. 30 жніўня 2009 году падчас авіяшоў у польскім Радаме разбіўся «Су-27» Баранавіцкай авіябазы, загінулі пілоты Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч. 21 красавіка 2010 года ля Ружан сутыкнуліся ў паветры два «МіГ-29», абышлося без ахвяр. 23 верасня 2010 году ў Ганцавіцкім раёне пацярпеў катастрофу «МіГ-29», загінулі лётчыкі Сяргей Каваленка і Аляксандр Жыгайла. 29 лістапада 2011 года ў раёне аэрадрому «Пружаны» адбылося крушэнне верталёта «Мі-24», тры чальцы экіпажа загінулі.

Чарговая катастрофа вайсковага самалёта, якая здарылася 12-га чэрвеня на Гарадзеншчыне, стала падставай для абмеркавання стану той тэхнікі, на якой служаць беларускія вайскоўцы, той матэрыяльнай базы, якую яны выкарыстоўваюць. Галоўным чынам гэта старыя савецкія машыны, абсталяванне і збудаванні, якія засталіся Беларусі ў спадчыну ад Савецкага Саюза. У краіне дагэтуль нямала занядбаных савецкіх базаў. Адна з іх знаходзіцца ў Клімавіцкім раёне.

У пасёлку Барсукі Клімавіцкага раёну ў савецкія часы дыслакавалася авіяцыйная частка. Пасля перабудовы авіябазу зачынілі. Некалькі вайсковых будынкаў аддалі пад школу, астатняе паступова разбураецца. Былы авіятар Аляксандр кажа: «Гэта было рашэнне выканкаму. Будынкі стаялі на балансе камунгасу. Усім раёнам тут бурылі. Шмат будынкаў прыбралі. Ніхто не хацеў браць іх. Яны без гаспадара стаялі і пачалі разбурацца. Аэрадром быў дужа добры. Ён і цяпер неблагі. Пасадачная паласа добрая. Толькі па швах трава прабіваецца».

Па сведчанню жыхароў былой вайсковай часткі: «Засталося тут тутэйшых мала. Пра нас ніякага клопату не было. Каму заставалася шмат служыць, паз'язджалі ў Расію, а каму мала заставалася — не было ім куды дзецца. Мясцовая ўлада пра нас не думала. Магла б і перасяліць куды-небудзь, але ніхто тады не думаў».

РЕАЛЬНАЯ БЕЗРАБОТИЦА В БЕЛАРУСИ — 24%

Реальная безработица в Беларуси примерно в 40 раз превышает официальную. Об этом свидетельствуют данные собственного исследования Gallup, приводимые gazetaby.com.



По данным Белстата, официальная безработица в Беларуси по итогам 2011 года составила 0,6%. Данная цифра отражает долю безработных, зарегистрированных в органах по труду, от общего числа экономически активного населения. Беларусь не рассчитывает уровень безработицы по методике Международной организации труда, которая предусматривает учёт не только официально зарегистрированных в качестве безработных граждан, но и тех, кто в отчётный период находился в поисках работы.

Согласно исследованию Gallup, уровень реальной безработицы в Беларуси по итогам 2011 года среди женщин составил 30%, среди мужчин — 19%. Учитывая соотношение между экономическими активными женщинами и мужчинами, можно рассчитать общий показатель реальной безработицы для Беларуси — 24%, что примерно в 40 раз выше официального показателя.

Gallup (Институт Гэллапа) — Американский институт общественного мнения, а также другие учреждения по изучению общественного мнения, основанные Джорджем Гэллапом. Gallup был основан в 1935 году, проводит регулярные опросы населения, пользуется международным авторитетом как один из наиболее надёжных источников информации о состоянии общественного мнения в США и во всём мире.



12 ЛЕТ НАЗАД В МИНСКЕ ИСЧЕЗ ОПЕРАТОР ОРТ ДМИТРИЙ ЗАВАДСКИЙ.

Татьяна ГУСЕВА, Салідарнасць

В официальную версию — похищение и убийство Завадского офицерами спецподразделения МВД «Алмаз» из мести за интервью «БДГ» — ни коллеги Дмитрия, ни его семья не верят. Напомним, в этом интервью журналист рассказывал о воевавших на стороне чеченских боевиков белорусах.

Ни один из офицеров «Алмаза», осужденных за убийство журналиста, своей вины не признал. Место захоронения Дмитрия Завадского неизвестно.

В 2005-м прокуратура возобновила уголовное дело по факту убийства Завадского. Но год спустя оно вновь было приостановлено с привычной формулировкой: «в связи с необнаружением безвестно исчезнувшего лица».

В мае 2006-го генеральный прокурор Беларуси Петр Миклашевич сообщил на пресс-конференции, что «в настоящее время местонахождение Завадского не установлено, но прокуратура Беларуси продолжает его поиск. Ранее проводились проверки ряда эпизодов по данному делу, и они проводятся в настоящее время».

О результатах этих проверок жена Дмитрия Светлана Завадская получала стандартные отписки: «О похищении вашего мужа было возбуждено уголовное дело. По нему отбывают наказание такие-то лица. Местонахождение Завадского установить не удалось».

За годы переписки с прокуратурой у жены и мамы Дмитрия накопились пухлые папки с ответами из правоохранительных органов.

Председатель юридической комиссии Белорусского Хельсинского Комитета Гарри Погоняйло посоветовал родным обращаться в МВД с запросами, какие розыскные мероприятия проводятся органами, с кем они сотрудничали.

— Ответы приходят как под копирку, — рассказала Светлана «Салідарнасці». — Столько лет молчания властей… С каждым годом все больше убеждаюсь: к гадалке не ходи, понятно, с чем это связано, и кто виноват…. Я так и думала, что на кого-нибудь повесят убийство Димы, чтобы успокоить общественность. Игнатович (главный фигурант уголовного дела — прим. «С») говорил, что моего мужа в глаза не видел, знал о нём только по фотографиям в прессе.

Светлана Завадская вспоминает, как писала в прокуратуру, чтобы провели отдельное расследование по факту того, что тогдашний генпрокурор Виктор Шейман мог быть замешан в этом деле. Каково же было ее удивление, когда обращение направили …Шейману!

— Получился замкнутый круг. Он должен был в отношении самого себя проверку провести, — говорит Светлана Завадская.

Жена пропавшего журналиста уверена: точку в этом деле может поставить только смена власти.

— Хотя, судя по Украине, при Ющенко дело Гонгадзе не было раскрыто. Демократия — не гарант того, что дело раскроют. Нужно, чтобы новая власть этого хотела. Поэтому я голосовала за того кандидата, который, по-моему, единственный поднимал тему исчезнувших людей…

Кстати, восемь лет назад Лукашенко признался журналистам, что располагает документами, которые могут превратить дело Завадского в «анти-дело». Что подразумевалось под этими словами и почему эти документы до сих пор не обнародованы — неизвестно. «Это моя боль единственная — Дима Завадский. Я бы многое отдал для того, чтобы узнать о судьбе этого человека», — заявил тогда Лукашенко.

В августе этого года Дмитрию Завадскому исполнилось бы 40 лет.

ШАРАМЕТ: СПРАВА ЗАВАДСКАГА НЕ РАСКРЫВАЕЦЦА З-ЗА САБАТАЖУ З БОКУ ЎЛАДАЎ

Іна СТУДЗІНСКАЯ, svaboda.org

7 ліпеня спаўняецца 12 гадоў з дня знікнення тэлеаператара ОРТ Змітра Завадскага.

Раніцай 7 ліпеня 2000 году Дзіма паехаў ў аэрапорт «Мінск-2» сустракаць свайго калегу з Масквы, журналіста Паўла Шарамета. З таго часу пра лёс Дзмітрыя Завадзкага нічога не вядома.


Пачынаючы з 2000 году, чатыры разы пракуратура закрывала і аднаўляла расследаванне справы знікнення Змітра Завадскага. Апошні раз крымінальная справа была прыпынена ў красавіку 2006 году, распавяла маці Змітра Вольга Завадская:

«Ніякіх перспектываў пакуль няма. Справа прыпыненая ўжо 6 гадоў таму. У апошнім лісце, які нам прыслалі, напісана так: „У сувязі з тым, што не знойдзены, так бы мовіць, прадмет пошуку, то бок Дзмітрый Завадскі, следства прыпыняецца“. А мы прасілі, каб нам патлумачылі, якія пошукавыя дзеянні праводзяцца, якія аператыўныя моманты там адбываюцца. Нам не адказалі. Пішуць, што калі з'явіцца штосьці новае, нам паведамяць».

Фармальна яшчэ ў 2002 годзе Мінскі абласны суд прызнаў вінаватымі ў выкраданні Завадскага былых байцоў спецпадраздзялення МУС «Алмаз» Валерыя Ігнатовіча, Максіма Маліка, былога курсанта Акадэміі міліцыі Аляксея Гуза і Сяргея Савушкіна. Ні адзін з іх віны не прызнаў. Два чальцы групоўкі былі прысуджаныя да пажыццёвага зняволення. У дачыннасць гэтых людзей да выкрадання Завадскага мала хто паверыў. Цела яго знойдзена не было. Калега і сябар Змітра журналіст Павал Шарамет кажа:

«Я цалкам перакананы, што справа не раскрываецца толькі з-за сабатажу з боку беларускіх уладаў. Таму што да гэтай пары і ў спецслужбах, і ў кіраўніцтве краіны ёсць тыя чыноўнікі і палітыкі, якія маюць непасрэднае дачыненне да выкрадання і забойства людзей. Прасвет у справе Завадскага, як і ў справе іншых выкрадзеных у Беларусі людзей, будзе толькі пасля таго, як зменіцца ўлада».

Сёлета Змітру Завадскаму было б 40 гадоў. Фактычна без бацькі вырас і рана пасталеў ягоны сын Юры, якому ўжо 21 год.



ОДИН ИЗ МНОГИХ «ЗАПУЩЕННЫХ» ЗАВОДОВ

Александр ВЛАД

Когда Александр Лукашенко шёл во власть, то в предвыборной программе будущего президента было и такое обещание: «Запустить заводы». После памятного 1994 года он «запустил» столько предприятий и организаций, что перевыполнил программу с лихвой. В Климовичском районе в этом плане особенно показательна судьба ЗМИ — Климовичского завода металлоизделий. Давайте вспомним, как это было.

На том месте, где сейчас расположены опустевшие корпуса завода, производственная деятельность была организована ещё в довоенные времена. В 1926 году здесь построили небольшую электростанцию и лесопилку, а несколько позже дополнительно открыли столярный цех и мельницу. После войны в ходе восстановления разрушенной промышленности района на этой территории организовали райпромкомбинат. В 50-е годы на комбинате целенаправленно расширяют направления деятельности, а с 1958 года начинают заниматься металлообработкой. Так появился ЗМИ, ставший одним из важных предприятий района.

Начинали с выпуска простой и несложной в изготовлении продукции — гвозди, школьные парты, детские санки. Согласно отчетам, в 1965 году было изготовлено более 8 тысяч парт, 60 тысяч санок, около 1400 бетонных колец для колодцев. Коллектив предприятия составлял 163 человека. В этом же году впервые начался выпуск фирменной продукции — детских колясок. Вначале пробная партия составила всего 100 штук. Но со временем и количество и ассортимент значительно выросли. На ЗМИ разработали несколько видов колясок — от обычных вариантов до комбинированных и портативных. Пик их производства пришёлся на 1988-1989 годы. Тогда с заводского конвейера ежегодно отгружали заказчикам до 100 тысяч колясок.

После распада Советского Союза и прихода к власти Лукашенко завод стал сдавать свои позиции. Выпуск продукции серьёзно сократился, товарный ассортимент также упал до минимума. На предприятии перебивались случайными заказами вроде партии дорожных знаков или мебели для районного отдела образования. Стал стремительно сокращаться коллектив, люди покидали предприятие. В 1999 году районная газета следующим образом охарактеризовала ситуацию на ЗМИ. Было написано, что завод находится почти в коме. Но районные власти обещали исправить положение, изредка давали кредиты, находили возможность для отсрочки по платежам.

В 2004 году на ЗМИ насчитывалось уже немногим более 40 работающих. Завод погряз в долгах и убытках, за хроническую неуплату отключили даже электроэнергию. Холодные производственные цеха пустовали, работ практически не проводилось. Делегация из райисполкома во главе с председателем Виталием Гришановым сообщила коллективу, что только за последний год убытки завода составили 60 миллионов рублей. Было допущено снижение планового задания: по производству промышленной продукции — в 5 раз, по потребительским товарам — в 8 раз, по розничному товарообороту — в 96 раз. Фактически производство на предприятии было парализовано. В качестве итогового вывода председатель райисполкома Виталий Гришанов подчеркнул, что на заводе «работают наши люди, которым необходимо помочь найти выход из сложившейся ситуации».

В следующем 2005 году выход был «найден». Завод металлоизделий прекратил своё существование.

СЛАДКУЮ ЖИЗНЬ НАМ УЖЕ ОБЕЩАЛИ

Елена ПОЛЯКОВА

Одним из главных козырей действующей власти до недавнего времени была стабильность: спокойная обстановка в стране, вовремя выплачиваемые зарплаты и пенсии, сдерживаемый рост цен на основные продукты питания. Министерство торговли уверяло граждан, что контролирует процесс и постоянно проводит мониторинг цен. Но уже в 2010 году, незадолго до президентских выборов, стали настойчиво распространяться слухи, что ожидается резкое подорожание сахара, чуть ли не до 5000 рублей за 1 кг. Народ кинулся сметать сладкий товар с прилавков. Страну охватила повальная «сахарная лихорадка».




Чтобы успокоить людей, в декабре 2010 года заместитель министра торговли Ирина Наркевич сделала заявление на запрос газеты «Аргументы и факты». Она сообщила, что в Министерстве не планируют поднимать в ближайшее время цены на сахар и удивлены ажиотажем вокруг него. Поэтому, дескать, потребители могут быть спокойны. Но, как говорят, дыма без огня не бывает. Благополучно, хотя и несколько нервозно, проводив 2010 год со старыми ценами, в новом 2011 году народ терялся в догадках, когда же цена на сахар все-таки подпрыгнет. Вопрос, а будет ли подорожание вообще, даже не обсуждался. И неутешительные прогнозы оправдались. За один месяц сахар два раза подымался в цене, вместо 2900 рублей 1 кг сахара стал стоить уже 3600 рублей. Подорожание составило сразу 20 с лишним процентов. Казалось бы, всё, вот оно, случилось. Но нет, разговоры об очередном подорожании сладкого продукта не стихали. Даже президенту пришлось выступить с заявлением, что до 1 июля подорожания точно не будет. Тут уж всем стало ясно, что опять придётся закупаться.

Как известно, в прошлом году цены на сахар росли несколько раз. И в этом году они по-прежнему стремятся вверх, на ценниках теперь пишут 8 и более тысяч рублей за кило. А ведь, вспомним, до президентских выборов сахар стоил — 2900! Но поведение властей не меняется, они опять начинают нас успокаивать, обещая, что цены вряд ли поднимутся выше. Честное слово, хочется верить, но воспоминания о событиях последних лет вызывают нехорошие предчувствия. Стоит только задуматься, сколько уже раз нам обещали «сладкую» жизнь…

ЛЮДИ-ЭКСПОНАТЫ

Светлана КАЛИНКИНА, «Народная воля»

Странно мы живём. Что для других — стыд и позор, для нас — обыденность. Что для других — норма, у нас — преступление.



…Ко Дню независимости белорусов решили поздравить праздничными плакатами. Редкий случай — но в честь национального праздника их напечатали на белорусском языке. Правда, с ошибками. Вместо «З Днём незалежнасці Рэспублікі Беларусь!» получилось «С Днем незалежнасці…» Теперь буковку «С» заклеивают.

И самое удивительное, что никто не сгорел со стыда. Наоборот, похвалили за то, что ошибка вовремя обнаружилась. А ведь могло и так случиться, что висели бы эти плакаты, написанные и не по-русски, и не по-белорусски. Подумаешь, важность — не знать родного языка!..

Или вот ещё пример, когда другие бы от позора за сердце хватались, а у нас история просто к слову пришлась.

Выступает первый вице-премьер правительства перед депутатами. Рассказывает о работе славной белорусской промышленности. Ясное дело, что катастрофы нет, всё совсем неплохо, и успехи у нас, и проценты, и прогнозные показатели в целом выполняются. Но… «Мы где-то года два назад привезли китайцев на льнокомбинат, — рассказал Владимир Семашко. — Они зашли в ткацкий цех и сначала удивились. Они думали, что попали в музей. Потом заулыбались: «Вы на этом работаете?..»

Конечно, китайцам смешно и забавно вдруг увидеть, на каких музейных экспонатах работают в цивилизованной европейской стране, которая миру мозги прожужжала рассказами о сотворенном экономическом чуде, мудром руководстве, правильности избранного пути. А тем временем белорусский лён, можно сказать, выродился. В мире он на пике спроса, цены — астрономические, но страна, где сам Бог велел лён выращивать, и льноводство убила, и льнопереработку. Не иначе, от большого ума, который вряд ли кому в мире по силам понять. А уж китайцам — так и подавно.

Потому что Китай за два десятилетия реформ превратился из нищей и голодной страны в державу мирового уровня, они знают, как много можно сделать и за пять лет, и за десять. Ну а нам 18 лет — не срок, нам времени не хватило.

Кстати, тот же Владимир Семашко, говоря о том, что не везде всё получается, честно признал: “Чего не хватает? Мозгов не хватает!”

Да, мозги это, похоже, реальная проблема. Потому что иногда мир удивляется, насколько они у нашей бюрократии своеобразные.

Например, некоторое время назад хитом интернета стала новость про то, как белорусские власти попросили согласовать название общественной организации “Пантелеймон” со… Святым Пантелеймоном.

Была такая история, когда слонимский активист, известный в городе врач Иван Шега решил зарегистрировать общественное информационное учреждение для пациентов «Пантелеймон». Название выбрал в честь Святого великомученика Пантелеймона, который, согласно церковному преданию, помогает избавляться от телесных и духовных болезней. Около 15 различных отрицательных ответов получил Иван Шега, будто он задумал создание чего-то супер-пупер крамольного. Но последний ответ оказался достоин премии “Нарочно не придумаешь” и, естественно, был высмеян и русскоязычными, и иностранными СМИ.

Из Единого государственного регистра Гродненской области Ивану Шеге ответили, что «не допускаются к согласованию собственные имена лиц, если они не совпадают с именами учредителей и учредители не получили разрешения таких лиц (их наследников)». Каким образом можно обратиться за согласованием к Святому Пантелеймону, жившему в конце III — начале IУ века, в Госрегистре не задумались. Но уровень бюрократической фантазии мир оценил. Редкое СМИ пропустило такую глупость.

Естественно, мир над нами смеется. Они же не живут во всем этом — им от нашей глупости и весело, и дико, и странно… Иногда — совсем не понятно, как такое может быть в XXI веке.

Зато совсем не весело нам. Потому что за подобную новость белорус может и в тюрьму угодить. Ведь в белорусском Уголовном кодексе есть статья “Дискредитация Республики Беларусь” — до двух лет лишения свободы. А к ней еще и уголовная статья “Клевета” добавляется — это если персонально какого-нибудь чинушу обидишь.

Журналисту Андрею Почобуту реально грозит до пяти лет лишения свободы за то, о чем говорила если не вся страна, то добрая её половина. И это уже совсем не шутки. Потому что в цивилизованных странах вообще не знают такого уголовного преступления, как клевета. Что-то про кого-то не то сказал или написал — есть Административный кодекс, максимальное наказание — штраф. И такой подход не только на Западе, в странах развитой демократии. В России, в Молдове, в Украине, в Кыргызстане, даже в Таджикистане исключили клевету из УК.

А у нас, в европейском государстве, — тюрьма, застенки, наручники, надзиратели… И попробуй скажи что-нибудь о бессмысленной, нецивилизованной, немотивированной жестокости белорусского режима. В ответ нескончаемым потоком польется: “клевета”, “дискредитация”, “пятая колонна”, “информационная война”, “кругом враги” …

Современная Беларусь — это какая-то страна парадоксов. На родном языке написать поздравление с главным государственным праздником не умеем, а хвалимся, что наше государство состоялось. Говорим, что у нас сильная власть, но ни одна, самая слабая, власть в странах-соседях так, как наша, свободного слова не боится. Чиновникам любая глупость, любое враньё прощаются, они государство априори не дискредитируют. А если ты не чиновник и что-то не то иностранцам сказал, то можешь быть наказан по всей строгости закона…

Китайцы на Оршанском льнокомбинате веселились, потому что подумали, что попали в музей. А ведь, если подумать, то вся Беларусь — это своеобразный музей, а мы в нём — этакие люди-экспонаты. Цивилизованный мир смотрит на нас, как на какое-то застывшее в своем развитии племя, и не понимает: смеяться им над нами или уже бояться.



ПРАЗДНИЧНЫХ ДНЕЙ У БЕЛОРУСОВ МЕНЬШЕ, ЧЕМ У РОССИЯН И КИТАЙЦЕВ

В Трудовом кодексе Беларуси количество праздничных дней меньше, чем у китайцев и россиян. Mojazarplata.by сравнила, кто больше отдыхает по трудовому законодательству.

СКОЛЬКО ОФИЦИАЛЬНЫХ ПРАЗДНИКОВ В БЕЛАРУСИ И КАК ОПЛАЧИВАЕТСЯ РАБОТА В ЭТИ ДНИ

Государственные праздники — это праздники, установленные в Республике Беларусь в ознаменование событий, имеющих особое историческое либо общественно-политическое значение для Республики Беларусь, оказавших существенное влияние на развитие белорусского государства и общества. Праздничные дни, в отличие от государственных праздников, — это иные дни, посвященные выдающимся событиям, традиционным датам, чествованию работников определенной профессии, отрасли хозяйства или сферы деятельности и т.д.

В силу предписаний п. 14 ст. 84 Конституции Республики Беларусь установление государственных праздников и праздничных дней отнесено к компетенции Президента Республики Беларусь.

В соответствии со ст. 148 Трудового кодекса РБ работа в государственные праздники и праздничные дни оплачивается не ниже, чем в двойном размере:

- работникам со сдельной оплатой труда — не ниже двойных сдельных расценок,
- работникам с повременной оплатой труда, а также получающим дополнительные оклады — не ниже двойных часовых ставок или окладов.

При этом для работников, получающих месячный оклад, оплата производится в размере не ниже одинарной часовой или дневной ставки сверх оклада, если работа производилась в пределах месячной нормы рабочего времени, и в размере не ниже двойной часовой или дневной ставки сверх оклада, если работа производилась сверх месячной нормы.

Если эта работа выполнялась сверх месячной нормы рабочего времени, работнику, по его желанию, предоставляется, кроме оплаты в повышенном размере, предусмотренной частью первой ст. 69 Трудового кодекса, другой неоплачиваемый день отдыха.

*СКОЛЬКО ОФИЦИАЛЬНЫХ ПРАЗДНИКОВ В ДРУГИХ СТРАНА*х

Государственных праздников и праздничных дней в Беларуси меньше, чем во многих странах. В частности, казахстанцы официально празднуют 15 дней, а россияне — 12.

Праздников в Беларуси значительно меньше, чем на Шри-Ланке (24 дня), в Бразилии, Бутане и Иране (21 день). Жители стран Западной Европы отдыхают от 11 до 13 дней в году.

Количество праздников в Беларуси и других странах в 2012 году: Беларусь — 9, Казахстан — 15, Россия — 12, Армения — 16, Азербайджан — 15, Израиль — 25, Китай — 15.

ШТО НІ ГАРАДОК, ТО ГАВАРОК, ШТО НІ СЯЛЬЦО, ТО СЛАЎЦО!

Паважаныя чытачы! Не забудземся пра роднае Беларускае Слова і напоўніцу скарыстаемся незлічонымі багаццямі Беларускай Мовы. У гэтай падборцы — беларускія прыказкі і прымаўкі.

Мець волю — здабудзем долю.
Пажыві для людзей — пажывуць і для цябе.
Адной рукой і вузла не завяжаш.
Хто чужога не шкадуе, той свайго не мае.
Лепей з разумным згубіць, як з дурнем знайсці.
Адзін жыве, як хочацца, а другі, як прыйдзецца.
Лепей бедны сусед, як багаты родзіч.
Чалавек без рамяства, як дзеўка без хараства.
Рукі залатыя, ды горла ўсе пажрала.
Не можаш памагчы, то лепей памаўчы.
Смелы і разумны жывуць два жыцці.
Каля пекла жывучы, трэба і чорта кумам паправіць.
Пажывем далей — пабачым болей.
Без прыказкі і з печы не зваліцца.

ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: БОЛЬШ ЗА 10000 БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯЎ

Праект "Беларуская інтэрнэт бібліятэка Kamunikat.org", які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, на працягу некалькіх гадоў мае фінансавую падтрымку Міністэрства замежных спраў Польшчы ў рамках праграмы "Польская дапамога".




kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

Партал існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў, якія выходзяць невялічкім тыражом. Ёсць і гістарычныя выданні: кнігі, газеты і часопісы, выдадзеныя ў Беларусі і ў эміграцыі.

Цікавай часткай бібліятэкі з'яўляюцца асабістыя старонкі беларускіх аўтараў, чые кнігі знаходзяцца ў бібліятэцы (http://kamunikat.org/bielaruskija_autary.html) і разьдзел "Што новага" (http://kamunikat.org/naviny.html), які дае магчымасьць знаёміцца з навінкамі беларускага выдавецкага рынку.

На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, аўдыё кнігі, газеты, аўдыё і відэа. Усяго размешчана больш за 10000 розных беларускіх выданняў. А ў раздзеле "Перыёдыка" знаходзяцца ўсе нумары "Клімавіцкай Інфа-Панарамы" за 2012 год.



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна